ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 21 (778) ● Пятніца, 5 чэрвеня 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

ВЫЗНАЧАНА ПРАГРАМА РАБОТ

Днямі падпісан пратакол па праграме работ на 1970—71 гг. паміж нашым і Сафійскім універсітэтам імя К. Ахрыдга.

Адпаведна дагавору аб супрацоўніцтве з кожным годам мацоць і пашыраюцца сяброўскія сувязі беларускіх і балгарскіх юных і студэнтаў. На сустрэчах у Мінску і Сафіі вызначаюцактуальныя навуковыя праблемы і шляхі іх сумеснага рашэння, адбываецца абмен думкамі. Прафесары і выкладчыкі у час паездак выступаюць з лекцыямі перад студэнтамі, знаёмяцца з лабараторыямі і сучасным абсталяваннем, якое выкарыстоўваецца у навуковых і вучэбных мэтах. Студэнцкія групы выязджаюць у братнія краіны на азнаямленча-вытворчую практыку.

Сёлета для падпісання пратакола аб супрацоўніцтве прыехалі да нас прарэктар Сафійскага універсітэта, Д. Сімаў і прафесар М. Мічэу. Яны азнаёміліся з універсітэтам, наведалі гістарычныя месцы Беларусі.

МІНЧАНЕ — ГАСПАДАРЫ ЎСЕСАЮЗНАЙ СУСТРЭЧЫ ФІЛОЛАГАЎ

Адпаведна плану Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР 17—20 чэрвеня гэтага года на філалагічным факультэце нашага універсітэта адбудзецца ўсесаюзная навуковая канферэнцыя па актуальных праблемах лексікалогіі. Мінскія мовазнаўцы ўпершыню выступаюць у ролі гаспадароў навуковай сустрэчы такога роду і маштабу. На канферэнцыі мяркуецца заслухаць каля 130 дакладаў і звыш 100 паведамленняў. Увага вучоных канцэнтруецца вакол трох асноўных праблем: «Семантычная структура слова і яе гістарычная змена», «Лексічная спалучаемасць і метады яе даследавання», «Прынцыпы семантычнага чляненння слоўнікавага саставу».

Сярод удзельнікаў сустрэчы будуць вядомыя савецкія лінгвісты І. А. Дзендзялеўскі, І. В. Арнольд, А. Н. Саўчанка, М. М. Капыленка, А. В. Бандарка, Н. І. Талстой, В. П. Грыгор'еў, І. С. Улуханаў і іншыя. Чакаецца прыезд вучоных з зарубежных універсітэтаў, якія супрацоўнічаюць з БДУ (Сафійскага, Люблянскага, Іенскага). Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі атрыманы ад 20 прафесараў і дактароў навук і 97 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

У лексікалагічнай канферэнцыі прымуць удзел спецыялісты з усіх канцоў нашай краіны. Больш трэці дакладаў і паведамленняў падрыхтавана беларускімі філолагамі. 48 заявак паступіла з РСФСР (у тым ліку 21 з Масквы), 36 — з УССР. На канферэнцыю прыедуць таксама прадстаўнікі Казахстана, Азербайджана, Узбекістана, Туркменіі, Кіргізіі, Літвы, Латвіі, Арменіі, Малдавіі.

Наш універсітэт прадстаўляюць прафесар А. Я. Супрун (старшыня аргкамітэта), прафесар М. Г. Булахаў (намеснік старшыні аргкамітэта), прафесар Л. М. Шакун, дацэнты П. П. Шуба, Б. І. Касоўскі і іншыя, якія выступяць з дакладамі.

Улічваючы прадстаўнічасць канферэнцыі і шырыню яе праблематыкі (ад тапанімікі да машыннага перакладу), можна быць перакананым, што канферэнцыя будзе не толькі садзейнічаць вырашэнню тэарэтычных пытанняў мовазнаўства і ўмацаванню навуковых сувязей, але і паслужыць выдатнай школай для маладых вучоных і аспірантаў.

Б. НОРМАН,
вучоны сакратар аргкамітэта, ст. выкладчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства.

НА ЗДЫМКАХ: (уверсе, злева направа) прарэктар Сафійскага універсітэта Д. Сімаў, прарэктар БДУ Л. В. Валадзько, прафесар М. Мічэу, дырэктар універсітэцкай бібліятэкі Р. Г. Любіна ля кніжнай выстаукі, прысвечанай Дню балгарскай культуры, асветы і славянскай пісьменнасці; (унізе) балгарскія госці у час наведання фізічнага факультэта. Прафесар У. Г. Вафіядзі (першы злева), дэкан факультэта І. П. Зяцькоў і прафесар Л. В. Валадзько пазнаёмілі балгарскіх вучоных з самым вялікім факультэтам універсітэта.

Фота Д. ПРЭСА.

ПОШУКІ СНТ ЖУРФАКА

Яшчэ не так даўно лічылася, што студэнту-журналісту не толькі не абавязкова, але і ўвогуле не патрэбна займацца навуковай работай у СНТ. Шкоднасць такога меркавання выліваласа у тое, што толькі асобныя аматары-адзіночкі удзельнічалі ў студэнцкім навуковым таварыстве журфака. Несуцяшальнымі былі вынікі і на рэспубліканскіх конкурсах.

Але за апошні навучальны год справа значна змянілася. Дэканатам, партыйным бюро, саветам СНТ і яго старшынёй студэнтам Смольскім было прыкладзена нямала намаганняў, каб паставіць гэты важны ўчастак на належны ўзровень. І вось вынік. На другі тур Усесаюзнага конкурсу прадстаўлена 9 работ журналістаў. Але гэта толькі мізэрныя поспехі журфака, калі ўлічыць, што на факультэце многа здольных студэнтаў, што СНТ ахапіла толькі частку з іх. Менавіта на гэта і ўказваў у сваім дакладзе старшыня СНТ Смольскі на сходзе камуністаў журфака.

— Да нас, членаў СНТ, праяўляецца недастаткова увагі з боку выкладчыцкага калектыву. Некаторыя лічаць, што гэты ўчастак работы павінны весці самі студэнты. А між тым на канферэнцыях СНТ часта бываюць гарачыя спрэчкі, і як добра было б, каб выкладчыкі дапамагалі нам вырашаць іх у правільным напрамку.

Гэтую думку, выказаную ў час спрэчак студэнтам-камуністам Міхальчанкам, падтрымалі ў сваіх выступленнях камуністы Цікоцкі, Пыжкоў, Дубовік, Дастанка і іншыя.

Так, СНТ журфака будзе ў ліку лепшых ва універсітэце толькі тады, калі яно стане па-сапраўднаму масавым, калі кожны студэнт і выкладчык не будзе стаяць ад яго ў баку.

І. САЧАНКА.

Залік па атамнай фізіцы ў трэцякурснікаў матфака прымае М. Д. Балабаева. Адказвае Н. Алатырцава.

Фота **Д. Чаховіча.**

ПА ВЕДАХ І ЎЗНАКА

Сапрауды гарачая пара зараз у студэнтаў. Ля аудыторый, дзе здаюць экзамены і залікі, можна убачыць і усхваляванага сур'ёзнага юнака, які у апошні раз праглядае канспект або шукае у падручніку не высветленае яшчэ пытанне, і шчаслівую студэнтку, якая толькі што атрымала выдатна, і у бязмернай роспачы няудачніка...

Вось, здаецца, адзін з такіх. Хлопец сумна гартае канспект. Знаёмімся. Гэта студэнт III курса матэматычнага факультэта Валерый Мархель. Ён прыйшоў здаваць залік па уводзінах у атамную фізіку другі раз.

— Як лічыце, Валерый, тое, што вы не здалі залік адразу, выпадковасць ці сведчанне недастатковай падрыхтоўкі?

— Па-мойму, наша выкладчыца Маргарыта Давыдаўна Балабаева веды студэнтаў ацэньвае аб'ектыўна. А мая няудача — крыху не давучыу. На пытанні білета адказваў добра, а вось на дадатковым заблытаўся. Прыйшлося ісці давучваць.

— А як вы працавалі на працягу семестра?

— Лекцыі наведваў амаль рэгулярна. Вёў канспект. Гэты прадмет у нас непрафіліруючы. Практычных заняткаў не было, лабараторных таксама. Да лекцый на працягу семестра не рыхтаваўся: думаў, адразу ўсё вывучу да заліку. Але курс не з лёгкіх...

На твары бялявай дзяўчыны, якая толькі што выйшла з аудыторыі, задаволеная ўсмешка. Гэта Галя Анішчык. Яна расказвае:

— Я ўжо дауно і сур'ёзна рыхтавалася да гэтага заліку. Заняткі наведвала рэгулярна, матэрыял засвоіла добра, таму і здала адразу.

— Галя, што, па-вашаму, перашкаджае некаторым студэнтам паспяхова здаваць гэты залік?

— Па-першае, трэба адзначыць, што лекцыйных гадзін для такога курса недастаткова. Мы ведаем, што для студэнтаў фізічнага факультэта пры вывучэнні гэтага прадмета адводзяць больш гадзін як лекцыйным, так і лабараторным заняткам.

Па-другое, мабыць, адчуваецца некаторая перагрузка у час сесіі. Як-ніяк, мы здаем цяпер 4 залікі і 5 экзаменаў.

Выкладчыца М. Д. Балабаева паведаміла, што большасць студэнтаў адказвала паспяхова. Многія глыбока засвоілі праграмны матэрыял. Не здалі залік толькі 8 чалавек з 210. Гэта у асноўным тыя, хто прапускаў лекцыі, несур'ёзна адносіўся да вывучэння прадмета.

Т. ДЗЕРАХ.

ВУЧОБА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

А гэта дыпломніцы хімфака Любоў Салауёва і Ніна Гулько, надзеленыя вопытам і мудрасцю пяцігадовага студэнцкага жыцця.

18 чэрвеня — абарона дыпломных. Таму і спяшаюцца выпускніцы усё удакладніць, прывесці у належны парадак.

Пасля заканчэння універсітэта Любоў Салауёва і Ніна Гулько прадоўжаць вучобу у аспірантуры.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

ПЕРШЫЯ ПЯЦЁРКІ БІЁЛАГАЎ

Студэнты другой групы першага курса біялагічнага факультэта на днях здалі экзамен па заалогіі беспазваночных. Экзаменатар Павел Рыгоравіч Пятровіч адказамі большасці студэнтаў задаволен. Вучэбны матэрыял група засвоіла вельмі добра. Гэтаму садзейнічала сістэматычная падрыхтоука студэнтаў да практычных заняткаў, якіх на працягу семестра праводзілася даволі многа.

У залікоуках М. Бутавец, Л. Барадаука, У. Збароускай, Л. Зялёнай, Г. Жук і многіх іншых паявіліся першыя у гэтую сесію пяцёркі.

І. СЁМІНА.

ПРЫЕМНА, КАЛІ ВЕДАЕШ

Хвалююцца цяпер і вячэрнікі. Іх настроем і пачуццямі таксама валодае сесія.

На другім курсе матфака займаюцца пераважна дзяучаты. Яны і аказаліся смялейшымі, пайшлі першымі здаваць залік па курсу агульнай фізікі. Як заусёды, у ліку першых і староста Таццяна Дроніна.

Дзяучаты атрымалі пытанні і схіліліся над паперамі. У лабараторыі усталявалася цішыня. Для іх яна неспакойная і напружаная. Уся увага сканцэнтравана на адным—даць поуны і вычарпальны адказ. Чыстыя лісты хутка запаўняюцца лічбамі, формуламі, графікамі. Наколькі паспяхова ідзе падрыхтоука, можна меркаваць па выразах твараў.

Вось пасвятлеу твар у дзяучыны, што сядзіць ля акна. Яна гатова адказваць.

— Калі ласка, Шпарык,—запрашае да стала студэнтку старшы выкладчык В. П. Бабровіч.

Дзяучына імклява падняалася і села побач з выкладчыкам. На пытанні адказвае спакойна і пераканауча, абгрунтоувае свае палажэнні формуламі. Некалькі дадатковых пытанняу не засмуцілі Раісу. У яе голасе тая ж упэуненасць, яна дае вычарпальныя адказы. З задавальненнем ставіць ёй выкладчык «залічана».

Поспех сяброукі акрыляе астатніх. Без ценю трывогі яны чакаюць сваёй чаргі.

Л. ПЕТЭРСОН.

НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) рыхтуюцца да адказу (злева направа) Зоя Фурса, Ніна Вайтко, Валянціна Хацяноуская і Таццяна Дроніна; (злева) залік здае Раіса Шпарык.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

ТАЛЕНАВІТЫ ВУЧОНЫ І АРГАНІЗАТАР

Наш універсітэт быў створан і вырас у буйнейшы навуковы і вучэбны цэнтр рэспублікі дзякуючы кіраўніцтву і паусядзённым клопатам аб ім Камуністычнай партыі Беларусі.

У стварэнні і развіцці універсітэта вялікую ролю адыграу адзін з выдатных дзеячоў бальшавіцкай арганізацыі Беларусі Вільгельм Георгіевіч Кнорын.

Актыуны удзельнік барацьбы за перамогу Кастрычніка на Беларусі, кіраўнік бальшавіцкага падполля ў час нямецкай акупацыі, В. Г. Кнорын пасля выгнання інтэрвентаў узначаліў партыйную арганізацыю рэспублікі як сакратар Цэнтральнага Бюро КП(б)Б.

Таленавіты арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва, В. Г. Кнорын быў і буйным вучоным. Ім напісан шэраг прац па гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі, па аграрнаму пытанню, па гісторыі міжнароднага рабочага руху. Пад рэдакцыяй В. Г. Кнорына ў 1934 г. выйшла «Кароткая гісторыя ВКП(б)». Ён быў адным з рэдактараў «Гісторыі ВКП(б), (частка 2-я)», надрукаванай у 1935 г. Абодва гэтыя падручнікі былі шырока вядомы працоўным Савецкага Саюза. Усяго В. Г. Кнорын апублікаваў больш 600 навуковых прац і артыкулаў у часопісах і газетах.

В. Г. Кнорын разам са старшынёй ЦВК БССР А. Р. Чарвяковым узначальваў кіраўніцтва усёй падрыхтоучай работай па стварэнню універсітэта. З першых дзён яго існавання В. Г. Кнорын займаў кафедру эканамічнай палітыкі. Ён чытаў курс «Эканоміка пераходнага перыяду».

Нягледзячы на перагрузку асноунай работай, В. Г. Кнорын з выключнай акуратнасцю выконваў свае абавязкі прафесара. Ён карыстауся вялікім аутарытэтам сярод выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта.

Акадэмік С. Я. Вальфсон пісаў у сваіх успамінах, што В. Г. Кнорын «жыва цікавіуся кожнай драбніцай, якая адносілася да універсітэта, і не раз ён забягаў да мяне позняй ноччу перагаварыць аб той ці іншай універсітэцкай справе».

Вільгельм Георгіевіч Кнорын належаў да тых дзеячоў, якія сваёй арганізацыйнай, выкладчыцкай і навуковай працай зрабілі вялікі уклад у справу стварэння і развіцця Беларускага дзяржаунага універсітэта.

Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.

СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

СТУДЭНТЫ—ДАСЛЕДЧЫКІ

Нядауна група народнага кантролю універсітэта праверыла работу студэнцкага навуковага таварыства. Прыемна зауважыць, што па выніках агляду навукова-даследчай работы вну БССР, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, універсітэту было прысуджана першае месца.

У 1969 г. на ўсесаюзны конкурс СНТ універсітэта прадставіла 18 работ. Аутары трох з іх узнагароджаны падзякамі. У гэтым годзе прадстаулена ужо 70 студэнцкіх даследаванняў.

А па выніках рэспубліканскіх конкурсаў у 1968 годзе першую катэгорыю атрымалі 89 работ з 266, у 1969 г.—95 работ з 277.

Аб росце зацікаўленасці навукова-даследчай работай сведчыць павелічэнне колькасці дакладаў, прадстаўленых на універсітэцкія студэнцкія канферэнцыі. Так, у 1969 г. на XXVI студэнцкай навуковай канферэнцыі было заслухана 450 дакладаў, а у 1970, юбілейным годзе — 706. Агульны лік членаў СНТ цяпер — каля 1500 чалавек.

Якім жа з'яўляецца становішча на асобных факультэтах? Спашлемся на канкрэтны прыклад фізічнага факультэта і факультэта журналістыкі. На фізічным факультэце лік дакладаў, прадстаўленых на навуковую студэнцкую канферэнцыю, павялічыўся ў 1970 г. у параўнанні з 1969 г. з 39 да 61. Павялічылася таксама колькасць работ, пасланых на рэспубліканскі агляд. З 42 конкурсных работ 1969 года трынаццаць атрымалі першую катэгорыю. Дваццаць два студэнты ў навукова-даследчай лабараторыі (СНІЛ) выканалі хоздагаворных работ у 1969 г. на 50 тыс. рублёў.

Амаль у паутара раза павялічылася у 1970 г. колькасць удзельнікаў навуковых канферэнцый на факультэце журналістыкі. Аддзелы СНТ ёсць тут на кожнай кафедры. Яны падтрымліваюць сувязь са студэнцкімі навуковымі таварыствамі буйнейшых вну краіны. На рэспубліканскі агляд студэнцкіх работ у 1969 годзе СНТ журфака прадставіла 15 работ, з якіх тры атрымалі першую катэгорыю. У 1970 г. было прадстаулена 26 работ. На факультэце выпускаецца штогадовы альманах і бюлетэнь СНТ.

На кожнай кафедры ёсць адказныя за работу студэнцкага навуковага таварыства, кожны выкладчык кіруе навуковай работай аднаго-двух студэнтаў. Вялікую ўвагу рабоце СНТ аказвае партарганізацыя факультэта.

Адзначыушы станоўчыя бакі у развіцці навукова-даследчай работы, група народнага кантролю выказала наступныя пажаданні:

Шырэй прыцягваць да навуковай работы студэнтаў малодшых курсаў шляхам арганізацыі для іх інфармацыйных сходаў, далучаць да работы семінараў на кафедрах.

Абавязкова выкарыстоўваць розныя формы заахвочвання як студэнтаў, якія займаюцца навукова-даследчай работай, так і выкладчыкаў, якія кіруюць гэтай работай.

Н. МІНІЦКІ,
член універсітэцкай групы народнага кантролю.

НА ПРАВЕРЦЫ—ІНТЭРНАТ

Два дні камісія групы народнага кантролю фізічнага факультэта правярала бытавыя умовы студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце № 5 па вуліцы Кастрычніцкай.

Цяпер у інтэрнаце жыве 488 студэнтаў фізічнага факультэта, 82 — хімічнага, 55 — матэматычнага, 25 — гістарычнага, 6—біялагічнага, 3 — філалагічнага, 175 замежных студэнтаў, слухачы курсаў удасканалення, 76 аспірантаў і супрацоўнікаў — усяго 944 чалавекі.

У гутарках са студэнтамі, аспірантамі і супрацоўнікамі выявілася, што сталовая тут працуе вельмі нездавальняюча. У меню мала блюд з натуральнага мяса, першыя блюды і гарніры нясмачныя. Падаюць дрэнна прасмажаныя катлеты, пракісшыя тварог і смятану. Бываюць выпадкі, калі блюды падаграваюць на наступны дзень. Дрэнна прамываецца пасуда і прыбіраецца зала, расклад работы сталовай нязручны для студэнтаў.

У жылых пакоях інтэрната не хапае мэблі (1—2 тумбачкі і 2 крэслы на 5 чалавек). Тут многа паламаных дзвярных ручак, разбітае шкло ў вокнах, сапсаваныя разеткі, выключальнікі, патроны.

На 944 чалавекі ёсць адна пральня, і тая дрэнна абсталявана. На два карпусы маецца толькі адзін бытавы пакой, у якім 2 сталы, 3 прасы, 2 люстры. Гэта ніяк не можа задаволіць патрэбы ўсіх студэнтаў.

Абодва каменданты, тт. Паўленка і Філімонаў, не удзяляюць належнай увагі навядзенню парадку у інтэрнаце, часта бываюць у нецвярозым стане або зусім адсутнічаюць на рабоце. Дзяжурныя слесары таксама прыходзяць на работу ў нецвярозым стане, не выконваюць сваіх службовых абавязкаў.

Дрэнна арганізавана дзяжурства ля ўваходу ў інтэрнат, не наладжана прапускная сістэма, камендант не інструктуе сутачны нарад дзяжурных.

У інтэрнаце жыве некалькі чалавек, якія не маюць ніякіх адносін да універсітэта.

Група народнага кантролю ў сваёй пастанове дала рад канкрэтных рэкамендацый, намецила тэрміны ліквідавання выяўленых недахопаў.

У гэтым месяцы народныя кантралёры правядуць паўторную праверку інтэрната па усіх пунктах, адзначаных у пастанове.

Н. ХАЎРАТОВІЧ,
старшыня групы народнага кантролю фізфака.

САСТА… ОРГАН… НАРОДН… КАНТРО… БДУ

На справазд… барных сходах, … былися у сакавік… года у сістэме …рганіну народнага кантролю, ва універсітэцкую і факультэцкія групы народнага кантролю выбрана 224 чалавекі.

Мужчын—125
Жанчын—99
Выкладчыкі —
(з вучонай ступенню)—29
(без вучонай ступені)—46
Супрацоўнікі—67
Студэнты—82
Адукацыя
вышэйшая—112
сярэдняя—80
Члены КПСС — 65
Члены ВЛКСМ — 90
Нацыянальнасць
беларусы — 128
рускія — 80
украінцы—8
яурэі — 6
грузіны — 1
татары — 1
Выбраны упершыню—137
Узрост
да 24 год—67
да 30 год — 39
да 40 год — 58
да 50 год — 42
больш 50 год — 18.

КАНТРАЛЁРЫ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ НЕДАХОПЫ

Сектар скарг, заяў і удасканалення адміністрацыйна-упраўленчага апарату універсітэцкай групы народнага кантролю праверыу справаводства у агульнай канцылярыі і дэканатах гістарычнага і філалагічнага факультэтаў. У выніку выяулен шэраг істотных недахопаў. Так, наменклатура спраў у агульнай канцылярыі і дэканатах не адпавядае зводнай наменклатуры, зацверджанай рэктарам. Журнал рэгістрацыі камандзіровачных пасведчанняў вядзецца з парушэннямі. Не выконваюцца некаторыя патрабаванні прыкладнай інструкцыі аб справаводстве у БДУ адносна аб'ёму спраў і афармлення дакументальных матэрыялаў, якія павінны здавацца у архіў. Мала дапамагае агульная канцылярыя ў паляпшэнні справаводства на факультэтах.

Каб выправіць становішча, група народнага кантролю прапанавала шэраг мер.

У ходзе праверкі было устаноулена, што праз агульную канцылярыю універсітэта праходзіць вялікая колькасць асабістых пісем студэнтаў і супрацоўнікаў, не памечаных грыфам «асабістае». Апрацоука іх адбірае многа часу і сіл у справаводаў, нрыводзіць да нерацыянальнага выкарыстання рабочага часу.

ГНК, абмеркаваушы гэтае пытанне, звяртаецца да студэнтаў і супрацоунікаў універсітэта з прапановай перадрасаваць сваю карэспандэнцыю па месцы жыхарства або памячаць яе абавязковым грыфам «асабістае».

ГНК звяртаецца да грамадскіх арганізацый і выкладчыкаў універсітэта з просьбан правесці сярод студэнтаў растлумачальную работу па гэтым пытанні.

В. РАМАНЕНКА,
загадчык сектара скарг, прапаноў і удасканалення адміністрацыйна-упраўленчага апарату ГНК.

Група народнага кантролю факультэта журналістыкі праверыла, як выкарыстоуваюцца абсталяванне і матэрыялы лабараторыі кафедры тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання.

Камісія устанавіла, што цяпер у лабараторыі апаратура забяспечана эксплуатацыйнымі матэрыяламі і утрымліваецца у спрауным стане. Аднак выяулена, што улік і справаздачнасць па выдачы расходных матэрыялаў практычна адсутнічае. Інструкцыя па уліку і справаздачнасці не выконваецца. Адсутнічае вопіс фанаграм.

Памяшканне, занятае над лабараторыю, не адпавядае элементарным патрабаванням. Для нармальнай работы з апаратурай студэнтам не хапае месца. Акрамя таго, памяшканне утрымліваецца у нездавальняючым санітарным стане. Прыбіраюць тут ад выпадку да выпадку.

Камісія лічыць, што для падтрымання нармальнага вучэбнага працэсу неабходна другое памяшканне для лабараторыі і для размяшчэння абсталявання. Для практычных заняткаў у лабараторыі неабходны тры стацыянарныя магнітафоны тыпу «МЭЗ» і спецыяльнае для іх абсталяванне. Лабараторыя мае вялікую патрэбу ў дадатковай колькасці вучэбных магнітафонаў тыпу «Рэпарцёр». Гэта неаднаразова выяулялася пры падрыхтоўцы студэнтамі вучэбных выпускаў радыёгазет.

Кафедры радыё і тэлебачання неабходна арганізаваць сістэматычны кантроль за работай лабараторыі і перыядычна заслухоуваць справаздачы загадчыка лабараторыі і лабаранта.

А. СЛУКА,
старшыня камісіі.

У. І. ЛЕНІН І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ЗАКОННАСЦЬ

У. І. Ленін, нягледзячы на сваю выключную занятасць кіраўніцтвам партыяй і будаўніцтвам новага грамадскага і дзяржаунага ладу у нашай краіне, пастаянна удзяляу вялікую ўвагу і надавау вялікае значэнне як тэарэтычнай распрацоўцы пытанняў сацыялістычнай законнасці, так і стварэнню і няўхільнаму умацаванню сацыялістычнага правапарадку у Савецкай краіне.

Камуністычная партыя і Савецкі урад і асабіста У. І. Ленін з першых жа дзён існавання Савецкай дзяржавы патрабавалі строгага выканання савецкіх законаў і заснаваных на іх прававых актаў. Гэтае патрабаванне выцякала з самой прыроды дэмакратычна цэнтралізаванай дзяржавы — дзяржавы рабочых і сялян, якая не магла мірыцца з тым становішчам, каб воля працоунага народа, палітыка партыі, увасобленыя ў савецкіх законах, не падтрымліваліся б і не выконваліся б няўхільна і з усёй строгасцю.

У. І. Ленін указваў на неабходнасць «...лічыцца не толькі з літарай, але і з ДУХАМ нашага, камуністычнага заканадаўства, не дапускаць НІ ЦЕНЮ адступлення ад нашых законаў...» З асаблівай сілаи Уладзімір Ільіч падкрэслівае, што «... законнасць не можа быць калужская і казанская, а павінна быць адзіная усерасійская і нават адзіная для усёй федэрацыі Савецкіх рэспублік».

Гэта прынцыповае указанне У. І. Леніна аб законнасці, адзінай для усёй краіны, лягло у аснову барацьбы Камуністычнай партыі і Савецкага урада за умацаванне законнасці у нашай краіне.

У справе забеспячэння сацыялістычнай законнасці У. І. Ленін першаступеннае месца адводзіу мерам выхавання, пераканання, прававой прапагандзе, якая садзейнічае развіццю сацыялістычнай прававядомасці грамадзян і службовых асоб, умацаванню законнасці і правапарадку.

Адным з аб'ектыўна неабходных і надзейных сродкаў у руках працоуных у справе забеспячэння няўхільнага выканання сацыялістычнай законнасці ва усіх сферах грамадскага жыцця нашай краіны У. І. Ленін лічыу народны кантроль. Праяуляючы няспынныя клопаты аб развіцці народнага кантролю, Уладзімір Ільіч указаў на неабходнасць стварыць у нашай краіне такія умовы, у якіх кожны прадстаунік масы, кожны грамадзянін мог бы удзельнічаць як у абмеркаванні законаў дзяржавы, так і у правядзенні іх у жыццё, у кантролі за іх ажыццяўленнем.

У. І. Ленін указаў на неабходнасць сістэматычна выхоуваць шырокія масы працоуных у справе самастойнага, хуткага, дзелавога удзелу іх у назіранні за падтрымліваннем законнасці, настойліва развіваць усе формы народнага кантролю.

Трывала увайшло у наша жыццё усенароднае абмеркаванне усіх важнейшых законапраектаў. Працоуныя прымаюць актыуны удзел у ахове правапарадку, з'яуляючыся членамі дабравольных народных дружын, членамі таварыскіх судоў, адміністрацыйных камісій, камісій па справах непауналетніх, назіральных камісій, абмяркоуваючы на сваіх сходах факты парушэння законаў і грамадскага парадку, беручы на парукі, на перавыхаванне правапарушальнікаў.

Важную ролю ў барацьбе з парушэннямі сацыялістычнай законнасці і дзяржаунай дысцыпліны адыгрываюць органы народнага кантролю, уся работа якіх заснавана на актыунай дзейнасці шматмільённай арміі працоуных. Аснову органаў народнага кантролю складаюць групы і пасты народнага кантролю. Іх цяпер у краіне больш 900 тысяч. У радах народных кантралёраў налічваецца каля 8 мільёнаў чалавек. Усё гэта з'яуляецца яскравым і пераканаучым сведчаннем таго, што далейшае развіццё сацыялістычнай дэмакратыі па шляху, указаному XXII і XXIII з'ездамі КПСС, служыць мэтам камуністычнага выхавання працоуных, росту палітычнай свядомасці і культуры грамадзян, умацаванню дзяржаунай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці.

У. І. Ленін з асаблівай сілай падкрэсліваў, што «рашэнні Савецкай улады маюць нябачаную у свеце сілу аутарытэту, сілу рабочых і сялян. Але нам гэтага мала. Мы — матэрыялісты, і нас сілай аутарытэту не накорміш. Не, паклапаціцеся правесці гэта у жыццё». Трэба свята выконваць законы і усе прадпісанні Савецкай улады і сачыць за іх выкарыстаннем усімі.

Падтрыманне ленінскай законнасці з'яуляецца важнейшай умовай далейшага умацавання Савецкай агульнанароднай дзяржавы — галоунага сродку будаўніцтва камунізма у нашай краіне.

Я. ТАГУНОУ,
старшыня групы народнага кантролю БДУ, кандыдат юрыдычных навук.

ВА УНІВЕРСІТЭТАХ КРАІНЫ

● Па рашэнню партыйнага камітэта у Адэскім дзяржаўным універсітэце імя І. І. Мечнікава створана двухгадовая школа маладых камуністаў. Яе слухачамі будуць камуністы, кандыдаты у члены КПСС, камсамольскія актывісты.

Праграма заняткаў прадугледжвае вывучэнне ленінскіх прац, тэарэтычнай і практычнай дзейнасці партыі, сустрэчы са старымі камуністамі, барацьбітамі за устанаўленне Савецкай улады, удзельнікамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Сістэматычна праводзяцца тэарэтычныя канферэнцыі, дэманструюцца кінафільмы.

● На медфаку Мардоўскага універсітэта працуе музычны лекторый, арганізаваны па ініцыятыве дэканата і партбюро.

Нядаўна ў лекцыйнай зале факультэта адбыўся чарговы канцэрт з твораў Бетховена.

● На юрыдычным факультэце Варонежскага універсітэта створан орган студэнцкага самакіравання — грамадскі дэканат.

Галоўная задача грамадскага дэканата — паляпшэнне вучэбнай дысцыпліны студэнтаў, задавальненне іх надзённых патрэб у галіне навукі і быту, далучэнне іх да кіравання грамадскім жыццём факультэта.

● Тэатру-студыі Ленінградскага універсітэта споўнілася 25 год. Нядаўна студыйцы пазнаёмілі студэнтаў са сваёй новай работай — спектаклем па п'есе Бертольда Брэхта «Страх і адчай трэцяй імперыі». Цяпер рыхтуюцца да пастаноўкі спектаклі па п'есах «Мешчанін у дваранстве» Мальера і «У навагоднюю ноч» Э. Брагінскага і Э. Разанава.

СВЕДКІ З МІНУЛАГА

ЯК ЖЫЛІ НАШЫ ПРОДКІ? Чым яны займаліся? Што іх цікавіла, як апраналіся?

Пра гэта можна даведацца, наведаўшы музей, які стварылі студэнты і выкладчыкі гістарычнага факультэта. Кожны год першакурснікі - гісторыкі вядуць археалагічныя раскопкі у розных раёнах нашай рэспублікі і за яе межамі. Іх знаходкі размясціліся цяпер у археалагічнай зале музея. Усе яны здабыты пры раскопках старажытных курганоў, паселішчаў і гарадоў.

Вось прадметы жалезнага веку. Многія з іх знойдзены пры раскопках старажытных гарадзішчаў у Асіповіцкім раёне. Тут і кераміка, жалезныя вырабы, бронзавыя упрыгожанні. Ёсць нямала вырабаў, знойдзеных на поўначы Беларусі: сярпы, гліняныя прэсліцы, вырабы з касці, скуры, наканечнікі стрэл...

Сабрана вельмі многа прадметаў, якія належаць дзесятаму стагоддзю. Іх знайшлі пры раскопках старажытнарускай вёскі непадалёк ад Мінска. Гэта—жорны, металічныя наканечнікі, старажытны плуг, абгарэушае зерне, сярпы. Вялікая колькасць упрыгожанняў з бронзы, шкляныя пацеркі і інш.

Шырока прадстаулена культура старажытных гарадоў на тэрыторыі Беларусі. На працягу некалькіх год студэнты гістфака вялі раскопкі у Оршы. Знойдзена многа вырабаў з жалеза, ключы, замкі, нажы, шкляныя бранзалеты, зброя.

На наступным стэндзе прадметы, знойдзеныя пры раскопках замчышча у Мінску (плошча 8 Сакавіка). Напрыклад, ёсць рэчы з майстэрні старажытнага ювеліра: ліцейныя формы, ювелірны пінцэт і некаторыя іншыя вырабы. Упершыню удалося знайсці кола ад павозкі. На падставе праведзеных раскопак быў створан макет Мінскіх варот, а таксама макет старажытнай сядзібы гаражаніна.

Тут жа знаходзяцца экспанаты, знойдзеныя пры раскопках у Крыме, у раёне Феадосіі.

Суседняя зала—Старажытнага Усходу. Для кожнай са старажытнаусходніх краін маецца спецыяльны шчыт, дзе пад шклом размешчаны фатаграфіі, якія паказваюць культуру і быт гэтых краін. Тут гіпсавыя копіі багоў і жрацоў, тут царства міфалогіі старажытнага Егіпта. Маюцца і арыгінальныя экспанаты з егіпецкіх грабніц, атрыманыя з Ленінградскага эрмітажа.

Бадай, самая цікавая—зала антычнай культуры. У ёй сабраны копіі статуй старажытнагрэчаскіх багоў. Тут размясцілася галерэя скульптур гістарычных асоб антычнасці —Гамера, Юлія Цэзара, Арыстоцеля, Платона.

Прыцягваюць увагу архітэктурныя упрыгожанні: разнастайныя капітэлі, маскі, барэльефы, гарэльефы. Каля сямідзесяці экспанатаў размешчана тут.

Побач — этнаграфічная зала. У ёй вы убачыце прадметы культуры і быту беларусаў. Яны сабраны у асноўным у Клімавіцкім раёне і у Брэсцкай вобласці: прылады сельскагаспадарчай працы, бароны, плугі, граблі, вілы; прадметы хатняга ужытку: ступа, жорны, дзежка, лыжкі. Тут жа ткацкі станок з прыладамі да яго, пралкі і самапралкі, лапці розных фасонаў.

Асобны стэнд займае мужчынская і жаночая верхняя вопратка, вышываныя сарочкі, маляўнічыя андаракі, світкі, рушнікі з прыгожымі беларускімі арнаментамі.

Экспазіцыя залы увесь час папаўняецца. Сюды кожны год з розных куткоў рэспублікі студэнты прывозяць усё новыя і новыя экспанаты, якія расказваюць пра жыццё беларускай вёскі у мінулым.

Яшчэ адна зала—зала нумізматыкі. Яе сцены увешаны шчытамі, на якіх размешчана звыш сямі тысяч манет, чаканеных у дауно мінуўшыя часы рознымі дзяржавамі Еуропы і Азіі. Тут ёсць манеты шостага стагоддзя да нашай эры, ёсць арабскія, антычныя, візантыйскія, рымскія, манеты Кіеўскай Русі, Залатой Арды і многіх еурапейскіх дзяржаў.

Гэта унікальная калекцыя, адна з самых вялікіх у Беларусі. Яна, бадай, адзіная у нашай краіне служыць вучэбным дапаможнікам для студэнтаў. Трэба адзначыць, што нумізматыку выкладаюць толькі у трох вышэйшых навучальных установах краіны, у тым ліку у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна.

Беларусь займае вядучае месца у Еуропе па колькасці знойдзеных скарбаў. За апошнія дваццаць гадоў у розных месцах рэспублікі знойдзена больш чатырохсот скарбаў — звыш сямідзесяці тысяч манет. Кожны год знаходзяць дзесяць-пятнаццаць скарбаў пры асушэнні балот, выкарчоўванні пнёў у лесе, у час палявых і будаўнічых работ, пры раскопках старажытных паселішчаў і магільнікаў.

А здараліся і кур'ёзныя выпадкі. Сто з лішнім гадоў назад каля Барысава селянін зауважыў птушку, якая часта вылятала з гнязда і вярталася з нейкім бліскучым прадметам у дзюбе. Калі ён зазірнуў у гняздо, убачыў у ім рускія, літоўскія і польскія манеты. Птушка знайшла дзесьці скарб і, захапіўшыся бляскам серабра, пачала пераносіць у гняздо манеты.

Быў выпадак, калі крот выносіў разам з зямлёй на паверхню рымскія манеты. Неяк размытая пасля дажджу дарога была усыпана арабскімі манетамі. А аднойчы на лузе свіння вырыла гліняны гаршчок з рымскімі і нідэрландскімі манетамі.

За апошні час у музей універсітэта паступіла пяць новых скарбаў. У Гродзенскай вобласці быў знойдзен яшчэ адзін вялікі скарб антычных манет. Акрамя таго, многа старадауніх манет прывозяць у музей студэнты-завочнікі.

В. СВЯТЛОЎ.



З КОМПАСАМ У РУКАХ

— Хутчэй! Ну, прабяжы! — крычаць рабяты. Эдзік Несцяровіч ужо не ідзе, ён з апошніх сіл бяжыць да фінішу. На твары кроплі поту. Так, нялёгка прабегчы 12 км па лесе і балоце і яшчэ знайсці 12 пікетаў.

А вось ужо вяртаюцца дзяючаты, у іх дыстанцыя—6 км і 7 пікетаў.

К вечару дазнаёмся: рабяты занялі пятае месца, дзяючаты—чацвёртае. Так заканчваецца першы дзень рэспубліканскіх спаборніцтваў ДСТ «Буравеснік» па спартыунаму арыентаванню.

А раніцай наступнага дня — эстафета. Тры этапы па 5 км, на кожным этапе 4—5 пікетаў.

У эстафеце універсітэцкая каманда выступіла лепш. Дзяючаты занялі першае месца, рабяты —трэцяе.

Нядрэнна паказалі сябе навічкі, якія выступалі ў другой камандзе. Сямёра з іх выканалі трэці спартыуны разрад па арыентаванню. А Люда Сухіна і Коля Гурын —другі.

Трэцяе агульнакаманднае месца у рэспубліканскіх спаборніцтвах — гэта поспех нашай каманды. Многія з удзельнікаў атрымалі жэтоны за прызавыя месцы у асобных відах.

М. ЯЎМЕНЧЫКАЎ, студэнт фізфака.

САЮЗНІКІ ЦІ ВОРАГІ?

— ідэальны знешні выгляд студэнта!

— Дасканаласць інтэлектуальнага, духоунага і фізічнага развіцця, — так адказаў на маё пытанне нехта з хлопцаў.

Але ж для таго, каб было першае, патрэбны веды, а іх даюць штодзённыя заняткі у аудыторыях і бібліятэках; для другога неабходна трэніроука цела, а гэта значыць, заняткі спортам. Ці можна сумяшчаць вучобу і спорт, ці не з'яуляюцца яны процілегласцямі, якія выключаюць адна другую!

Ва універсітэце 1.257 студэнтаў наведваюць секцыі па 25 відах спорту. Для іх адкрыты дзверы трох спартыуных залаў, акрамя таго, праводзяцца трэніроукі у лёгкаатлетычным манежы і на водна-спартыуным камбінаце. Для рэгулярных заняткаў створаны усе умовы. Кваліфікаваныя трэнеры шмат сіл прыкладаюць для таго, каб студэнты унікалі ва усе сакрэты спартыунага майстэрства. І зусім не выпадкова, што многія з іх выступаюць за зборныя каманды рэспубліканскага студэнцкага спартыунага таварыства «Буравеснік».

Аднак сярод некаторых студэнтаў бытуе меркаванне, што заняткі спортам толькі перашкаджаюць вучобе. Ёсць рабяты, якія да паступлення у БДУ займаліся спортам, але пасля таго, як атрымалі запаветны студэнцкі білет, закінулі сваё былое захапленне. Яны кажуць, што не хапае часу.

Сапрауды, вельмі важна спланаваць свой працоуны дзень так, каб трэніроукам быў адведзен выразна акрэслены час, каб яны былі разрадкай пасля напружаных заняткаў у аудыторыях або бібліятэках.

Трэнеры выявілі наступную заканамернасць. Поспехі ў вучобе тых студэнтаў, якія уходзяць з секцыі і пры гэтым спасылаюцца на недахоп часу, ніколі не паляпшаюцца, а якраз наадварот. Часу на вучобу ім усё роуна не хапае. І тут ужо вінаваты не спорт, а адсутнасць самадысцыпліны, нейкая унутраная расхлябанасць. Яны не разумеюць, што заняткі спортам з'яуляюцца лепшым лякарствам ад гэтай страшэннай для студэнтаў хваробы.

Ва універсітэце займаецца шмат студэнтаў, якія атрымліваюць выдатныя адзнакі на экзаменах і разам з тым перамагаюць на спартыуных пляцоўках і стадыёнах. Гэта члены зборных БССР па розных відах спорту — Таццяна Чупракова, Леанід Бахманау, Мікалай Інін, Леанід Крук і многія іншыя.

Напэуна, мала хто ведае, што кандыдат хімічных навук Л. Станішэускі у мінулым адзін з мацнейшых лёгкаатлетаў студэнцкага таварыства «Буравеснік», што кандыдат матэматычных навук В. В. Бабкоу—кандыдат у майстры спорту па альпінізму, а дацэнт У. А. Ціток быў адным з лепшых у зборных універсітэта па баскетболу і лёгкай атлетыцы. Для іх спорт не быў тормазам на шляху да навукі.

Усім вядомы поспехі студэнтаў матэматычнага факультэта. У мінулым годзе яны занялі першае месца у XVII спартакіядзе універсітэта. У гэтым ёсць і заслуга намесніка дэкана факультэта, дацэнта У. Т. Воднева, які унёс вялікі уклад у справу арганізацыі спартыунамасавай работы на факультэце. Гэта не выпадкова: Уладзімір Трафімавіч у мінулым сам быў выдатным спартсменам, абараняў гонар універсітэта на велагонках. Я звярнуўся да яго з пытаннем: «Спорт і вучоба — саюзнікі ці ворагі!». Вось што ён адказаў:

— Калі чалавек паступае ў вну па прызванню, то для яго спорт будзе, безумоўна, толькі саюзнікам. Акрамя таго, што занятні спортам фізічна загартоуваюць студэнта, робяць яго больш спрытным і моцным, яны дапамагаюць развіць такія якасці, як уменне сканцэнтраваць у патрэбную хвіліну усе сілы, усю волю. У такім выпадку спорт дапамагае нам рабіць са студэнта добрага спецыяліста. Але я супраць таго, каб спорт для будучага матэматыка стаў самамэтай, каб ім спекулявалі у час здачы экзаменаў. Нядаўна да мяне прыходзіла маці студэнта, якога мы выключылі за непаспяховасць. Са слязьмі у вачах яна прасіла, каб мы не выключалі сына, бо ён добры спартсмен. Але ж у нас універсітэт, а не інстытут фізічнай культуры.

На нашым факультэце займаецца чэмпіён СССР па шашках Анатоль Гантварг. Захапленне гэтым цікавым відам спорту не стаіць у яго на шляху да ведаў. У канчатковым выніку ён марыць стаць матэматыкам, і спорт яму у гэтым не перашкаджае.

В. СІНЕНКА,
студэнт 3-га курса факультэта журналістыкі.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 21652. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Заказ 760.